7. *Набокова, Л. С.* Перспективы внедрения технологий дополненной и виртуальной реальности в сферу образовательного процесса высшей школы / Л. С. Набокова, Ф. Р. Загидуллина // Профессиональное образование в современном мире. – 2019. – Т. 9, № 2. – С. 2710–2719.

8. *Пэн, Ван.* О применении хореографических техник и приемов в хореографических произведениях / Пэн Ван // Массовая культура и искусство. – 2013. – № 18. – С. 152–153.

9. *Сиснерос, Р. Э.* Виртуальная реальность и хореографическая практика: потенциал новых творческих методов / Р. Э. Сиснерос, К. Вуд, С. Ватли, М. Букколи, М. Занони, А. Сарти // Body, Space & Technology. – 2019. – № 18 (1). – С. 1–32.

10. *Chan, J. C. P.* Virtual Reality Dance Training System Using Motion Capture Technology / J. C. P. Chan, H. Leung, J. K. T. Tang, T. A. Komura // IEEE Transactions on Learning Technologies. – 2011. – Vol. 4, № 2. – P. 187–195.

11. *Di, J.* Development and Creation of Dance Art from the Perspective of New Media / J. Di // Argos. – 2019. – Vol. 36, № 72. – P. 85–90.

12. Dutch National Ballet [Electronic resource]. – Mode access: https://www.operaballet.nl/. – Date access: 19.01.2022.

13. *Iqbal, J.* A review on making things see: Augmented reality for futuristic virtual educator / J. Iqbal, S. S. Manjit // Cogent Education. – 2017.

14. *Sun, G.* An Advanced Computational Intelligence System for Training of Ballet Dance in a Cave Virtual Reality Environment / G. Sun // IEEE International Symposium on Multimedia. – Taichung, 2014. – P. 159–166.

УДК [769.91:7.091.8](476)

***С. У. Сізянкова,***
*саіскальнік вучонай ступені кандыдата культуралогіі,*
*спецыяліст па праектнай дзейнасці*
*грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз дызайнераў»*

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ ПЛАКАТА Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

**Анатацыя**. У артыкуле разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай школы плаката канца XX – пачатку XXI ст., а таксама фактары, якія паўплывалі на гэты працэс, – супярэчлівыя сацыяльна-эканамічныя працэсы канца XX ст., актыўны ўдзел беларускіх творцаў у міжнародных выставачных праектах і конкурсах, развіццё інфармацыйных тэхналогій, дзейнасць грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз дызайнераў» і інш. Прыведзены пералік найбольш вядомых сучасных

дызайнераў і мастакоў, сярод якіх Р. Найдзен, Ю. Тарэеў, У. Цэслер і інш. Нягледзячы на тое, што плакат застаецца рэкламным і агітацыйным сродкам, пачынаючы з 1990-х гг. адным з вядучых напрамкаў развіцця і выкарыстання беларускага плаката становіцца выставачная дзейнасць.

**Ключавыя словы**: беларускі плакат, інфармацыйныя тэхналогіі, выстава.

***S. Sizenkova,***
*Applicant for the degree of Candidate of Cultural Studies, Project Specialist of the Public Association "Belarusian Union of Designers"*

## DEVELOPMENT OF THE BELARUSIAN POSTER SCHOOL AT THE END OF THE XX – BEGINNING OF THE XXI CENTURY

**Abstract**. The article examines the main trends in the development of the Belarusian poster school at the end of the 20th – beginning of the 21st century, as well as factors that influenced this process, such as the contradictory social and economic processes of the end of the 20th century, the active participation of Belarusian artists in international exhibition projects and competitions, the development of information of technologies, activities of the public association "Belarusian Union of Designers" and others. The article lists the most famous modern designers and artists, among them R. Naidzen, Y. Tareev, U. Tssler and others. Although the poster remains an advertising and campaign tool since the 1990s, one of the leading areas of development and use of the Belarusian poster is exhibition activity.

**Keywords**: Belarusian poster, information technologies, exhibitions.

Актуальнай з’явай сучаснай культуры застаецца плакат, які выконвае не толькі ўтылітарную інфармацыйна-рэкламную функцыю, але выступае сродкам камунікацыі, адначасова рэалізуе эстэтычную функцыю, з’яўляючыся творам мастацтва і часткай культуры, назапашваючы і транслюючы вопыт, каштоўнасці і традыцыі пэўнага грамадства.

Феномен беларускага плаката разглядаецца пераважна з мастацтвазнаўчага пункта гледжання, яму прысвечаны даследаванні Е. І. Атраховіч, А. Г. Галубовіч, Я. Ю. Ленсу, Т. В. Саладоўнікавай, Н. Н. Саратоўскай і інш. Сёння плакатнае мастацтва развіваецца пад уплывам працэсаў глабалізацыі і інфармацыйна-тэхнічнага прагрэсу, што патрабуе дадатковага даследавання і ацэнкі тэндэнцый развіцця і перспектыў эвалюцыі беларускай школы плаката ў кантэксце сучаснасці.

На сучасны стан беларускай школы плаката вялікі ўплыў аказалі супярэчлівыя працэсы канца XX ст.: страта грамадствам ранейшых ідэалагічных арыенціраў, няпэўная размытасць каштоўнасных уяўленняў, катэгорый ацэнак, складаная эканамічная атмасфера. Гэта паўплывала не толькі на жанрава-тэматычныя асаблівасці плакатнага мастацтва гэтага перыяду, але таксама і на тыражнасць друкаваных твораў – плакат усё больш становіцца выставачнай з'явай.

Беларускія плакатысты канца XX ст. часцей арыентуюцца на тэматыку і праблематыку міжнародных выставачных форумаў. Актыўна ўдзельнічаюць беларускія аўтары ў такіх праектах, як Міжнароднае біенале графічнага дызайну ў Брно, Міжнароднае біенале плаката ў Варшаве, Міжнароднае трыенале плаката ў Таяме, Міжнароднае трыенале сцэнічнага плаката ў Сафіі і інш., іх уваходжанне ў міжнародную плакатную супольнасць паспрыяла далучэнню беларускага мастацтва да асэнсавання і вырашэння агульных праблем міжнароднага быцця, а таксама пазітыўна паўплывала на агульны мастацкі ўзровень плакатнага мастацтва: сталі выкарыстоўвацца новыя плакатныя тэхнікі, прыёмы стварэння вобразаў у плакаце, стылявыя магчымасці і г. д.

Нягледзячы на тое, што, як лічыць Н. Н. Саратоўская, беларускае плакатнае мастацтва 1990-х гг., у параўнанні з плакатам перыяду перабудовы, губляе «свае сувязі і з нацыянальнай глебай, сацыяльнымі праблемамі сучаснай ім рэчаіснасці» [2], беларускі плакат усё ж не паўтарае створанае замежнымі майстрамі, а застаецца ўнікальнай з'явай, што пацвярджаецца прызнаннем на прэстыжных выставачных форумах, дзе менавіта беларускія плакатысты заваёўваюць міжнародныя адзнакі, прэміі і ўзнагароды.

Вядомымі прадстаўнікамі беларускай школы плаката гэтага перыяду з'яўляюцца мастакі-плакатысты, якія сфарміравалі лепшыя традыцыі прафесійнай беларускай плакатнай школы, – У. Цэслер, С. Войчанка, Р. Найдзен, А. Наважылаў, С. Саркісаў, А. Шалюта, А. Кітаева, Д. Сурскі, Т. Гардашнікава і інш. [4]. Менавіта яны ў 1990-я гг. прадстаўлялі беларускі плакат за мяжой, вызначыўшы яго месца на міжнароднай арэне («Стагоддзе Уладзіслава Стрэмінскага» (1993 г.) А. Кітаевай увай-

шло ў шорт-ліст XVI біенале прыкладной графікі ў Брно; «Chernobyl» (1996 г.) А. Наважылава – IV Міжнароднага біенале плаката «4-ы блок»; «Марк Мерман» (1995 г.), «Cheese» (1995 г.), «VITA NOVA» (1995 г.), «Jazz tour» (1998 г.), «Вудстак. 30 гадоў. Levi's» (1999 г.), «Таварыш Гарэлка» (1999 г.) С. Войчанкі і У. Цэслера ўвайшлі ў шорт-ліст Міжнароднага біенале плаката ў Варшаве; «Libertas» (1999 г.) Р. Найдзена – Міжнароднага біенале плаката ў Варшаве і Біенале палітычнага плаката ў Монсе).

Мяжа XX–XXI стст. адзначана актыўнай творчасцю маладых беларускіх аўтараў-плакатыстаў: Ю. Галавінай, У. Свентахоўскага, А. Наважылава, А. Маёрава, В. Санько, Д. Аленік, Ю. Тарэева, М. Кузняцовай, М. Ягоравай і інш. [1, с. 91]. Новае пакаленне мастакоў сумяшчала плакатную творчасць з працай у сумежных галінах выяўленчага мастацтва, што адлюстроўвалася ў элементах нестандартнасці плакатных тэхнік, прыёмах і спосабах плакатных рашэнняў.

Пры стварэнні плакатаў выкарыстоўваліся разнастайныя стылявыя канцэпцыі: ад рэалізму да абстрактнага экспрэсіянізму, ад канцэптуалізму да канструктывізму і г. д. Адбываецца складанае змешванне традыцый, робіцца частым зварот да розных стылявых узораў, па-новаму трактуюцца мастацкія катэгорыі прасторы і часу. Назіраецца тэндэнцыя да адметнасці, ускладненай філасафічнасці плакатных твораў. Павелічэнне насычанасці вобразнай сістэмы, узбагачэнне сэнсавага і эмацыянальнага гучання плакатных лістоў робіць іх канцэпцыйным аўтарскім плакатам [2].

Актыўна дзейнічае ў гэты час грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз дызайнераў», якое займае важнае месца ў станаўленні сучаснай беларускай школы дызайну і, у прыватнасці, беларускай школы плаката.

Адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці Беларускага саюза дызайнераў з'яўляецца захоўванне і папулярызацыя культурнай спадчыны. Беларускі саюз дызайнераў валодае поўнай калекцыяй беларускага друкаванага плаката з 1940-х гг. да пачатку XX ст., а таксама калекцыяй замежнага плаката (літоўскага, польскага, расійскага, украінскага) савецкага і сучаснага перыядаў. Унікальная калекцыя ўключае вядомыя ва

ўсім свеце працы, якія захоўваюцца ў знакамітых музейных калекцыях такіх гарадоў, як Брно, Лахці, Тояма, Осака, Лондан, Нью-Ёрк, Парыж, Варшава, Мехіка і інш. Дзякучы анлайн-рэсурсу «Беларускі плакат» можна пазнаёміцца з калекцыяй плакатаў, аўтарамі, тэматычнымі падборкамі, а таксама мастацтвазнаўчымі і культуралагічнымі артыкуламі па тэме. Рэсурс пастаянна дапаўняецца новымі працамі сучасных беларускіх плакатыстаў. Архіў дае шырокія магчымасці для мультымедыйнага прадстаўлення твораў, стварэння віртуальных выстаў і г. д. [3, с. 247].

Сёння адным з вядомых беларускіх плакатыстаў з’яўляецца Ю. Тарэеў. Плакат «Tolerance» беларускага дызайнера ўвайшоў у трыццатку пераможцаў Міжнароднага конкурсу сацыяльнага плаката «Mut zur Wut», у якім прыняла ўдзел амаль тысяча плакатыстаў з 66-ці краін. Дызайнер вядомы па афішах да спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы – «Дзеці Ванюшына», «Чычыкаў», «Каханне ў стылі барока», «Хам», «Маэстра», плакатамі «Эль Лісіцкі. 125 гадоў з дня нараджэння», «Афсет. Джаз», «Джузэпэ Вердзі. Атэла», «Гамлет», «Каханне перамагае смерць» [5, с. 160]. З апошніх адзначаных на міжнародным узроўні прац Ю. Тарэева варта згадаць плакаты «Рамэа і Джульета» (гран-пры Міжнароднага фестывалю тэатральнага плаката ў Арменіі, 2022), «Rigoletto» (1-е месца Міжнароднага конкурсу плаката «PosterFest 03» у Будапешце, 2022 г.), «Игорь Стравинский» (гран-пры I Міжнароднага біенале плаката, арганізаванага ў галерэі «B.I.» ў Саннаме, 2021 г.).

Сёння нароўні з вядомымі майстрамі беларускую школу плаката прадстаўляюць і студэнты, не толькі трапляючы ў шорт-лісты, але і заваёўваючы ўзнагароды: «Euro?» (2012 г.) В. Несцярук адзначана журы ў «Honorable mentions» на V Міжнародным конкурсе студэнцкага плаката «Money for free» (Скопье, Македонія); «Права жанчын» (2016 г.) Н. Васьковіч атрымала першую ўзнагароду ў катэгорыі «Студэнты» III Міжнароднага біенале плаката ў Любліне; «УНОВИС» (2016 г.) М. Расолька – прэмія ў намінацыі «Культурна-ідовішчны плакат» IV Маскоўскага конкурсу плаката; «Н.Ф.Б.» (2018 г.) К. Дарожка – спецыяльная прэмія імя Аляксандра Родчанкі «За

пошук і эксперымент як развіццё традыцый рускага канструктывізму» Маскоўскага міжнароднага біенале графічнага дызайну «Залатая пчала». Д. А. Сурскі адзначае: «Відавочна, што гэтыя вынікі не выпадковыя – за імі штодзённая творчая педагічная праца, красамоўныя прыклады асабістага поспеху настаўнікаў, іх перакананасці ў тым, што толькі ў глабальнай ацэнцы плакат набывае праўдзівае гучанне ў сілу сваёй прыроды, як універсальнай візуальнай мовы міжкультурнай камунікацыі, вырываючыся за межы правінцыяльнай фанабэрыі і самаздаволення» [4].

На развіццё сучаснага беларускага плакатнага мастацтва вялікі ўплыў аказвае ўдасканаленне інфармацыйных тэхналогій і сродкаў камп’ютарнай графікі. Працэс стварэння плакатаў стаў значна прасцейшы і больш даступны, што дазваляе казаць пра ўзнікненне новага тыпу плаката – лічбавага, ці інтэрнэт-плаката, які існуе толькі ў віртуальнай копіі і распаўсюджваецца ў Інтэрнэце, у тым ліку ў сацыяльных сетках.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што з канца XX ст. беларускі плакат выйшаў на міжнародны ўзровень, стаў развітай вобласцю прафесійнай дызайнерскай дзейнасці, трывала заняў сваё месца ў айчыннай мастацкай культуры. Да асноўных тэндэнцый развіцця беларускай школы плаката можна аднесці пераважную арыентаванасць на выставачную дзейнасць, актыўнае ўключэнне аўтараў у міжнародную культурную і мастацкую прастору, удзел у прэстыжных міжнародных конкурсах і выставах. Сёння беларускі плакат перажывае пэўныя змены, яго ўтылітарная інфармацыйна-рэкламная функцыя ажыццяўляецца пераважна ў Інтэрнэце, але разам з тым ён прадстаўлены і ў грамадскім асяроддзі ў выглядзе раздрукаваных рэкламных, культурных і сацыяльных афіш, білбордаў. Ранейшая галоўная прымета плаката – тыражаванасць – практычна адсутнічае, на першым плане сёння – выставачны плакат, які становіцца канцэптуальным творам, аўтарскай рэфлексіяй на актуальныя падзеі. Варта адзначыць, што плакаты канца XX – пачатку XXI ст. складана аднесці да якога-небудзь аднаго сюжэтна-жанравага віду ці пэўнага тыпу, бо яны ўжо не абмяжоўваюцца толькі функцыямі інфармацыі і рэкламы, а набываюць самастойную культурную і мастацкую каштоўнасць.

1. *Атраховіч, Е. І.* Беларускі плакат: асаблівасці станаўлення нацыянальнай мастацкай школы / Е. І. Атраховіч // Культура. Навука. Творчасць : зб. навук. арт. – Мінск, 2013. – Вып. 7. – С. 89–93.

2. *Саратоўская, Н. Н.* Сучасны беларускі плакат (1990–2000) [Электронны рэсурс] / Н. Н. Саратоўская // Беларускі плакат : афіцыйны сайт. – Рэжым доступу: https://plakat.unid.by/blogosphera/sovremennyy-belorusskiy-plakat- 1990-2000. – Дата доступу: 07.04.2022.

3. *Сізянкова, С. У.* Механізмы эфектыўнага кіравання аб’ектамі культурнай спадчыны на прыкладзе калекцыі плаката Беларускага саюза дызайнераў / С. У. Сізянкова // Трансфармацыя сацыяльна-культурнай сферы ў сучасных умовах: эканоміка-кіраўнічыя аспекты : матэрыялы ІІ Міжнар. студэнц. навук.-практ. канф., Арол–Мінск, 10 снежня 2021 г. / Арлоўскі дзярж. ін-т культуры, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Арол, 2022. – С. 244–248.

4. *Сурскі, Д. А.* Залатая калекцыя беларускага плаката [Электронны рэсурс] / Д. А. Сурскі // Беларускі плакат : афіцыйны сайт. – Рэжым доступу: https://plakat.unid.by/blogosphera/zalataya-kalekcyya-belaruskaga-plakata. – Дата доступу: 07.04.2022.

5. *Ялоўчык, Ю. Я.* Прыярытэтныя напрамкі дызайну Беларусі канца XX – пачатку XXI стст. / Ю. Я. Ялоўчык // Гарызонты : зб. навук. арт. / рэдкал. : Т. Г. Бараноўская [і інш.]. – Гродна, 2017. – С. 158–162.

УДК 792.9

***Д. С. Скачков,***
*кандидат искусствоведения,*
*доцент кафедры теории и истории искусства*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# КОНЦЕПТУАЛЬНОЕ ОСМЫСЛЕНИЕ И ОПРЕДЕЛЕНИЕ ОСНОВНЫХ ХАРАКТЕРИСТИК СОВРЕМЕННОГО ТЕАТРА

**Аннотация**. Статья посвящена разностороннему рассмотрению понятия «современный театр». Не представляется возможным достоверно определить данный термин через темпоральную характеристику. Предлагается рассмотреть современный театр через содержательный, формальный, жанровый и качественный аспекты. Современное содержание театрального спектакля раскрывается в актуальной тематике и проблематике. Формальный аспект проявляется в многообразии инновационных драматургических, актерских и визуальных выразительных средств сценического действия. Среди новых «современных» театральных жанров выделяются: документальный театр (техника вербатим),